# ЭВАЛЮЦЫЯ КНІГІ: АД ДРУКАВАНАЙ СКАРЫНАЎСКАЙ ДА ЭЛЕКТРОННАЙ

**Г. У. Казлоў, В. Г. Крывалапаў, Т. М. Шаўчук**

*Установа адукацыі «Беларускі гандлева-эканамічны ўніверсітэт спажывецкай кааперацыі», г. Гомель*

Навуковы кіраўнік К. Р. Федарцова, канд. філал. навук, дацэнт

У 2017 г. у Полацку падчас Дня беларускага пісьменства мы будзем святкаваць 500-годдзе беларускага кнігадрукавання. Які шлях прайшла кніга за апошнія 500 гадоў, якія задачы ставілі перад сабой выдаўцы і ўладальнікі кніг, якія трансфармацыі зведала кніга – усё гэта стала мэтай нашага даследавання. Намі былі акрэслены наступныя задачы: 1) высветліць, які ўклад унёс Ф. Скарына, распачаўшы беларускае і ўсходнеславянскае кнігадрукаванне; 2) прасачыць развіццё кнігі па стагоддзях ад XVI да XXI; 3) прааналізаваць станоўчыя і адмоўныя бакі электроннай кнігі. У працэсе даследавання былі выкарыстаны метады: апісальны, параўнальна-супастаўляльны, статыстычны.

У далёкім 1517 г. у Празе палачанін Францыск Скарына выдае першую з надрукаваных ім кніг «Бібліі» – «Псалтыр». Першадрукар імкнецца далучыць простага чалавека да асветы, тлумачыўшы незразумелыя стараславянскія і іншамоўныя словы адпаведнымі словамі старажытнай беларускай мовай. Гэтыя тлумачэнні атрымалі назву *глосы* (ад грэч. – ‘мова, гаворка’). Так, са Скарынаўскіх кніг бяруць свой пачатак двухмоўныя беларускія слоўнікі. «Акрамя тлумачэнняў, у кожнай кнізе змяшчаліся прадмовы і пасляслоўі, якія з’яўляюцца не толькі ўзорам старабеларускай мовы, але і змяшчаюць цэлую філасофскую канцэпцыю беларускага асветніка» [1, с. 17–18].

Кнігі Ф. Скарыны вылучаюцца высокімі выдавецкімі і друкарскімі якасцямі. Беларускае кнігадрукаванне адразу пачалося з высокага еўрапейскага ўзроўню. «Рэнесансныя выданні Ф. Скарыны, адметныя мастацкім, гравюрным, арнаментальным упрыгожваннем, шрыфтам і іншымі кампанентамі выдавецкай эстэтыкі і майстэрства, былі арыентаваны на ўсе пласты беларускага насельніцтва» [2]. Кнігі нашага першадрукара зрабілі вялікі ўплыў на развіццё духоўнай культуры усходніх славян, стымулявалі ўзнікненне кнігадрукавання ў Маскоўскай Русі і распаўсюджваліся ў шматлікіх рукапісных копіях. Арнаментальныя матэрыялы Віленскай друкарні Ф. Скарыны да 1652 г. выкарыстоўваліся ў выданнях найбуйнейшай беларускай друкарні – Віленскай брацкай друкарні і яе філіяла – Еўінскай друкарні. Некаторыя пражскія ініцыялы асветніка сустракаюцца ў выданнях Астрожскай друкарні ва Украіне ў канцы XVI ст.

Распачатае Скарынам кнігадрукаванне і працяг гэтай справы яго паслядоўнікамі значна панізіла каштоўнасць рукапісаў, але не адразу знішчыла іх стварэнне. Ужо ў XVI ст. патанненне кнігі спрыяе таму, што яна становіцца даступнай і цікавай не толькі для людзей адукаваных. Кніга трапляе ў дамы людзей розных слаёў насельніцтва і служыць як для навучання, так і для забавы. У XVII ст., з прычыны ўдасканаленняў у друкарскай справе, кніжная вытворчасць прагрэсуе ў колькасці, таннасці і прыгажосці.

XVIII ст., стагоддзе асветы, уздымае кнігу на небывалую вышыню. Гэта быў час зараджэння і развіцця рускай друкаванай кнігі. Пры Пятры I яна зарадзілася, а пры Кацярыне II – атрымала сілу і распаўсюджванне, хаця ў прамежку іх праўлення працэс кнігадрукавання здзяйсняўся вельмі павольна. З 80-х гг. ужо выдаюцца цэлыя бібліятэкі класікаў і перакладных раманаў. Рускія людзі прызвычаіліся чытаць і нават купляць кнігі.

У першай чвэрці XIX ст. у гісторыі развіцця кнігі выдзяляюцца два важныя моманты. Па-першае, добрая кніга стала ўзбагачаць аўтара. Гэта адбывалася не праз падарункі і пенсіі ад урада, а з дапамогай пакупнікоў і публікі. Па-другое, прадпрымальныя выдаўцы задаюцца высакароднай задачай зрабіць больш таннай добрую кнігу да такой ступені, каб кожны чалавек, нават з невялікім дастаткам, мог без вялікіх расходаў скласці цэлую бібліятэку.

У XX ст. у абстаноўцы надзвычай хуткага росту друкаванай інфармацыі і пашыранага распаўсюджвання новых сродкаў масавых камунікацый (радыё, тэлебачанне, кіно, інтэрнэт) перад кнігай узнікаюць новыя праблемы: «удакладненне спецыфічнай функцыі ў агульнай сістэме сродкаў масавых камунікацый, удасканаленне кніжнай арганізацыі (асваенне новых друкаваных матэрыялаў, мініяцюрызацыя выданняў, аптымізацыя чытання, уключэнне ў навуковыя і навучальныя кнігі гуказапісаў, стэрэаскапічных малюнкаў), павышэнне якасці паліграфічнага выканання і інш.» [3].

XXI ст. адзначаецца новым выглядам кнігі, дзякуючы развіццю мабільнасці. Атрымліваюць сваё развіццё і пашырэнне электронныя кнігі. «Тэрмін «электронная кніга» (таксама е-кніга, англ. e-book) прымяняецца ў адносінах да кнігі, якая змяшчае інфармацыю звычайнай кнігі, але прадстаўленую ў лічбавым фармаце і размешчаную на электронным носьбіце (CD-ROM, DVD-ROM і інш.)» [4].

Павелічэнне колькасці публікацый («інфармацыйны бум») паставіў перад бібліятэкамі пытанне аб захоўванні гэтага вялікага масіву інфармацыі. З'яўленне электроннай інфармацыі і сеткі інтэрнэт дазваляе не друкаваць інфармацыю ў выглядзе папяровых кніг, а захоўваць яе на значна больш ёмістых электронных носьбітах у электронных бібліятэках, падаючы доступ да яе як лакальна, так і дыстанцыйна – праз Сусветную сетку.

Кнігі ў такім выглядзе маюць станоўчыя бакі і адмоўныя, аднак, у сувязі з некаторай нязручнасцю існуючых сістэм чытання электронных кніг (напрыклад, хуткасць чытання такіх кніг, паводле даследавання «Nielsen Norman Group», саступае ў сярэднім на 10 % хуткасці чытання іх папяровых аналагаў), даволі часта аддаецца перавага традыцыйным папяровым, падтрымліваючы іх вытворчасць на дастатковым узроўні. Тым не менш, сёння многія імкнуцца аблічбаваць існуючыя друкаваныя кнігі, каб забяспечыць зручнасць захоўвання іх на электронных носьбітах і бесперашкодны доступ да іх усіх жадаючых. Таксама ёсць напрацоўкі і для працэсу іх публікацыі, напрыклад, друк па патрабаванні, электронныя часопісы і да т. п.

Такім чынам, кніга прайшла доўгі і складаны шлях ад друкаванай да электроннай. Якой яна стане праз наступныя 500 гадоў, сказаць цяжка, але магчыма кніга будзе мець зусім іншы выгляд. Аднак верагоднасць выкарыстання друкаванай папяровай кнігі ў будучым застаецца і каштоўнасць яе будзе вельмі высокай, як зараз у нас стаўленне да рукапісных кніг. Варта адзначыць, што і сёння пераважная большасць людзей (мы праводзілі анкетаванне сярод студэнтаў) традыцыйна выбірае кнігу з друкарскім водарам і пахам тыпаграфскай фарбы, хаця і не адмаўляе паралельнае чытанне электроннай кнігі.

Спіс літаратуры

1. Федарцова, К. Р. Беларуская мова. Эканамічная лексіка : вучэб. дапам. / К. Р. Федарцова. – Мінск : РІВШ, 2014. – 260 с.
2. Режим доступа: https://be.wikipedia.org/wiki/Францыск Скарына.
3. Режим доступа: https://www.kazedu.kz /referat/193575.
4. Режим доступа: https://ru.wikipedia.org/wiki/Книга.